*Анастасія Гулак*

## Спадарыня Іра, яе Марсік і яе Каця

Як гэта людзі п'юць каву без каваіну? – неяк раніцай разважала сама сабе спадарыня Іра. – Гэта тое ж, што чакалядка без чакаляду, або шампань без градусаў…

Яны б яшчэ выдумалі ката без вусаў!

Марсік вельмі цікавіўся біялогіяй раслін. І Кацю падбухторваў. Бывае, пагрызуць хрызантэм або гваздзікоў у вазе, пакусаюць таўсцянку ці проста раздзяруць фольгу ад букета.

Гэта прыносіла радасць пазнання і радасць паядання.

Сумуючы па сваіх улюбёных занятках, Марсік часам абураўся: – Чаму некаторыя дацэнты не носяць дадому букетаў?

– Затое некаторыя дацэнты носяць дадому кілбасу! – супакойвала Марсіка Каця.

Марсік часта пад'ядаў з Кацінай місачкі.

– У нашым з табой мікрасоцыуме, Каця, разгарнулася барацьба за выжыванне! – паведамляў ён пры гэтым.

Пачакай, прыгажун! Прыйдуць рабочыя з дрэллю, будзе табе барацьба за выжыванне! – маўчала Каця.

Яна ўмела трываць. А Марсік баяўся дрэлі.

Спадарыня Іра любіла чакаляд, ахвотна ела таксама цукеркі, цясткі і печыўцы. У гэтыя моманты жыцця яна аддавалася прыемным марам: «Некалі зраблю гатэль для катоў… Не, лепш зраблю каціную службу знаёмстваў…»

Гламурныя настроі цёткі Іры цалкам падзяляла Каця. Марсік не зважаў на баб і займаўся сапраўднай мужчынскай працай – лічыў варон за акном.

Аднойчы спакой Кацінай сям'і парушыўся. На некалькі дзён да цёткі Іры прывезлі котачку Рудзю, далёкую сваячку персаў, не вельмі калматую, месцамі ў плямкі, месцамі ў палосачкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– Хаця б адвялі гэта дзіця да артадонта! – шкадавала Рудзю Каця.

– Хаця б мне не зменшылі пайку! – трывожыўся Марсік.

Рудзя выявіла сябе як дзеўка добрая, кампанейская. Ні ў кога нічога не адбірала, навучылася бегаць па дыяганалі. І спадарыня Іра яе палюбіла.

Што ў нас тут за жыццё будзе, калі яна пачне розных чужынак апякаць? – абураўся на гаспадыню Марсік. – Так і суверэнітэт можна страціць!

Часам ён мысліў стратэгічна.

Дома спадарыня Іра заўсёды ўключала тэлевізар. Карцінкі на экране мільгацелі, несліся разнастайныя гукі – народ быў не супраць. Каці вельмі падабаўся Барыс з рэкламы Kitekata. Але яна падазравала яго ў легкадумнасці. Марсюшка Кацю не раўнаваў.

Бяжы, – клікаў ён, – ужо твайго паказваюць!

Раўнаваць не раўнаваў, але пры нагодзе помсціў за здраду.

Цётка Іра некалькі разоў выпускала Марсіка з кватэры. І ён узяў моду гуляць па лесвічнай пляцоўцы: смела хадзіў, адважна нюхаў і бясстрашна прыслухоўваўся.

Вятры далёкіх вандраванняў надзімалі Марсікавы ветразі. Манілі экзатычнымі пахамі і нязведанай воляй.

А родны бераг чакаў Рудога Капітана.

Дзверы спадарыня Іра заўсёды пакідала адчыненымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ